# Мелодыі скрыпкі Майстра. Творчая сустрэча з Аляксандрам Сурбам

16.07.2024




Пад гукі святкавання 90-годдзя Мінскага раёна ў музейна-выставачным комплексе Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" адбылася творчая сустрэча з Аляксандрам Сурбам. У камернай абстаноўцы экспазіцыйнай залі "Музыка вячорак" усе ахвочыя даведаліся ад спадара Аляксандра пра інтэграцыю сусветнага гістарычнага і сучаснага досведу ў вырабе і рэстаўрацыі струнных смычковых музычных інструментаў, які акамулюецца ў сценах навукова-даследчага аддзела Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, вядучым навуковым супрацоўнікам якога, уласна, і з'яўляецца спадар Аляксандр.

Канструяванне, рэстаўрацыя, скрыпічнае мастацтва — скрыпкабудаванне і майстэрства "размовы" з матэрыялам, італьянскі Страдывары і беларускі Бохан, а яшчэ і шмат іншых тэм было ўзнятае падчас сустрэчы. Жывая размова і пытанні да Майстра ўзнікалі не выпадкова, бо тэматычная экспазіцыя, дзе адбывалася сустрэча, уздымала музычны інтарэс.

Экспазіцыя "Музыка вячорак" была створаная ў 1992 годзе (аўтар канцэпцыі і збіральнік калекцыі музычных інструментаў — Уладзімір Бярбераў) з мэтай прадстаўлення беларускіх традыцыйных музычных інструментаў з так званага вясельнага гурту: скрыпкі, цымбалы, гармонікі, бубны, жалейкі і г.д. За дзесяцігоддзі збірання калекцыя музычных інструментаў сёння аб'яднала амаль 200 адзінак: струнных, духавых, ударных і іншых інструментаў. Скрыпак у зборы Запаведніка захоўваецца больш за 20. Сярод іх — нямецкага і чэшскага вырабу пачатку XX стагоддзя, фабрычныя скрыпкі, перарobленыя народнымі майстрамі ў другой палове XX стагоддзя, а таксама самабытныя самаробныя скрыпкі.

Змястоўная сустрэча спалучылася з унікальнай магчымасцю і сапраўдным майстар-класам: самыя смелыя змаглі паспрабаваць сябе памочнікам майстра і выбраць залішняе дрэва на дэках будучага інструмента, а некаторыя — нават змаглі выканаць на скрыпцы, створанай Аляксандрам Сурбам, музычны твор і адчуць, як лятуць лірычныя, вытанчаныя і пявучая мелодыі скрыпкі Майстра.



